# На градцы

*Паўлюк Прануза*

— Я пайду з табою, —
Кажа маме Натка.
Вынесла з падворка
Граблі і лапатку.

— Вось і твая градка, —
Мама паказала.
Натка з захапленнем,
З радасцю капала.

Выбірала чыста
Рэшткі пустазелля,
Каб мятлюг і пырнік
Зноў тут не аселі.

Як жывыя, граблі
Па градзе прайшліся.
Роўненькая градка,
Хоць па ёй каціся.

У зямлю сырую,
Нібы ў цёплы ложак,
Леглі морква, бручка
Хораша, прыгожа.

Пахваліла мама
Натку за работу.
Твар яе свяціўся
Зорачкамі поту.